# МІХАІЛ ІОСІФАВІЧ МУШЫНСКІ
## (Да 85-годдзя з дня нараджэння)



2016 год – юбілейны для Міхаіла Іосіфавіча Мушынскага ў двух аспектах: 85-годдзе з дня яго нараджэння і шасцідзесяцігоддзе навуковай дзейнасці (у 1956 годзе ён пачаў працу ў Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР).

М. І. Мушынскі – член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа. Такія факты афіцыйнага прызнання і ўшанавання заслуг і дасягненняў гэтага вучонага можна працягваць іншымі сцверджаннямі і азначэннямі, развіваючы іх і ўдакладняючы.

Грунтоўная характарыстыка этапаў навуковай дзейнасці М. І. Мушынскага і іх вынікаў здзейснена ў бібліяграфічным даведніку «Міхаіл Іосіфавіч Мушынскі (да 80-годдзя з дня нараджэння)»[1]. У гэтай крыніцы прадстаўлены асноўныя даты жыцця і дзейнасці вучонага, бібліяграфія яго навуковых прац, даследаванняў, якія ён рэдагаваў і інш. Акрамя гэтага, у дадзеным выданні зафіксаваны сведчанні і характарыстыкі адносна навуковых інтарэсаў і дзейнасці вучонага (артыкулы членакарэспандэнта НАН Беларусі В. А. Каваленкі, прафесара В. П. Рагойшы, ліст акадэміка Л. М. Навічэнкі). У адпаведных частках даведніка паўстае асоба Міхася Іосіфавіча як даследчыка і навуковага каардынатара, арганізатара з рознабаковымі інтарэсамі (гісторыя беларускай літаратуры, крытыкі і літаратуразнаўства, ацэнка твораў беларускай літаратуры з пазіцыі гістарычнай рухомасці, тэксталогія, выдавецкія праекты і адпаведныя канцэпцыі выданняў, праца ў саветах па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый, выступленні ў ролі навуковага апанента па доктарскіх і кандыдацкіх дысертацыях, навуковае рэдагаванне разнастайных даследаванняў, арганізацыя і каардынаванне навуковых канферэнцый, прынамсі, «Каласавінаў», «Гарэцкіх чытанняў» і інш.).

Навуковыя інтарэсы М. І. Мушынскага і іх вынікі асэнсоўваліся і асвятляліся ў артыкулах Д. Бугаёва, С. Лаўшука, М. Мішчанчука, У. Конана, А. Марціновіча, В. Жураўлёва, В. Каваленкі, Т. Голуб, В. Рагойшы[2] і інш.

З упэўненасцю можна сцвярджаць, што навуковая праца М. І. Мушынскага – гэта каштоўная і неад'емная старонка беларускага літаратуразнаўства, адным з галоўных вынікаў якой з'яўляецца стварэнне своеасаблівага напрамку, які можна вызначыць наступным чынам: *навуковая школа М. І. Мушынскага* ў гісторыі літаратуразнаўства і літаратурнай крытыкі, у тэксталогіі і выдавецкіх праектах, навуковым кіраўніцтве дысертацыямі, апаніраванні і экспертызе дысертацый. У сувязі з гэтым можна прыгадаць наступныя знакавыя для беларускага літаратуразнаўства факты: стварэнне гэтым даследчыкам «*творчых гісторый*» мастацкіх твораў Я. Коласа, манаграфій па гісторыі беларускай крытыкі і літаратуразнаўства, «*летапісаў жыцця і творчасці*» М. Зарэцкага, М. Гарэцкага, Я. Коласа, «*тэксталогіі твораў*» Я. Купалы, Я. Коласа; асэнсаванне літаратурна-крытычнага працэсу, асаблівасцей беларускай тэксталогіі ў форме аглядавых артыкулаў; падрыхтоўка тэксталагічных каментарыяў да твораў (Я. Купалы, М. Багдановіча і інш.); распрацоўка «*прынцыпаў, канцэпцыі выдання твораў*» (Я. Коласа, Я. Купалы, І. Шамякіна); «*спроба сучаснага прачытання*» твораў (Я. Коласа, К. Чорнага, М. Гарэцкага, М. Зарэцкага, І. Шамякіна і інш.). У прыведзеным вышэй пераліку ў якасці апорных вызначэнняў узяты аўтарскія ў адносінах да пэўных пісьменнікаў, аднак яны поўнасцю падыходзяць і да іншых творцаў у галіне мастацкай літаратуры, дзейнасць якіх разглядаецца гэтым даследчыкам у іншых навуковых кантэкстах.

[1] Міхаіл Іосіфавіч Мушынскі : да 80-годдзя з дня нараджэння / Нац. акад. навук Беларусі ; склад. Т. Ф. Мушынская. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 94 с.

[2] Бібліяграфічнае апісанне артыкулаў названых аўтараў гл. у: Міхаіл Іосіфавіч Мушынскі : да 80-годдзя з дня нараджэння / Нац. акад. навук Беларусі ; склад. Т. Ф. Мушынская. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – С. 55–58.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Многія працы М. І. Мушынскага можна вызначыць як выхад на стварэнне адметных жанраў сучаснага літаратуразнаўства, для якіх уласцівы непаўторны і пазнавальны (!) даследчыцкі стыль, метадалогія, што вызначаюцца гістарычнай далікатнасцю і ў той жа час прынцыповасцю, доказнасцю і пільнай увагай да тэксту мастацкага твора, дакумента, сведчанняў, фактаў гісторыі, доказнасць і пераканальнасць супастаўленняў, параўнанняў, бездакорная сістэматызацыя літаратурнага і біяграфічнага матэрыялу («Беларуская крытыка і літаратуразнаўства» (20–30-я гады)» –1975 г., «Беларуская крытыка і літаратуразнаўства: 40-я – першая палова 60-х гг.» – 1985 г., «Каардынаты пошуку: Беларуская крытыка: набыткі, перспектывы» – 1988 г., «І нічога, апроч праўды: Якой быць "Гісторыі беларускай літаратуры"» – 1990 г., «Нескароны талент: Праўдзівая гісторыя жыцця і творчасці Міхася Зарэцкага» – 2005 г., «Тэксталогія твораў Янкі Купалы і Якуба Коласа» – 2007 г., «Падзвіжнік з Малой Багацькаўкі: Жыццёвы і творчы шлях Максіма Гарэцкага» – 2008 г., «Мае Каласавіны: З вопыту вывучэння літаратурнай і грамадска-культурнай дзейнасці Якуба Коласа» – 2010 г., «Летапіс жыцця і творчасці Якуба Коласа» – 2012 г. і інш.).

Паказальная з'ява ў навуковай дзейнасці М. І. Мушынскага – яго імкненне да яднання даследчыкаў розных рэгіёнаў у справе здзяйснення пэўных праектаў і праграм. Выразным сведчаннем таму можа быць стварэнне па яго ініцыятыве часовага навуковага калектыву пры Магілёўскім дзяржаўным універсітэце, які плённа супрацоўнічаў з аддзелам выданняў і тэксталогіі Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі ў працэсе падрыхтоўкі да выдання першага навукова каментаванага Збору твораў І. Шамякіна ў 23 тамах.

Прафесар М. І. Мушынскі – аўтар больш за 370 навуковых прац, 15 манаграфій і навуковых кніг. Паказальная прыкмета яго даследаванняў – навуковая і грамадзянская надзённасць. Сведчаннем таму можа з'яўляцца, напрыклад, яго манаграфія «І нічога, апроч праўды…», у якой прапануўваецца своеасаблівае выйсце з той сітуацыі, калі палярныя тэндэнцыі ў сучасным беларускім літаратуразнаўстве ў адносінах да нацыянальнай мастацкай літаратуры савецкага часу ў пэўных адносінах ставяць даследчыкаў па розныя бакі навуковых «барыкад». У сувязі з гэтым варта прыгадаць наступную выснову М. І. Мушынскага: «*Стварэнне новай навуковай «Гісторыі беларускай літаратуры» сёння ўсведамляецца як задача выключна вялікага грамадска-палітычнага і нацыянальна-культурнага значэння. І сапраўды! З якой бы рашучасцю мы ні выкрывалі сталінізм і сталіністаў, адміністрацыйна-камандную сістэму, сучасны бюракратычны апарат, – працэс фарміравання нацыянальнай свядомасці будзе разгортвацца запаволена да таго часу, пакуль уся праўда пра наша мінулае – далёкае і нядаўняе – не стане агульным здабыткам грамадства*»[3].

Названыя вышэй і іншыя метадалагічна-стылёвыя прынцыпы, на якія паслядоўна арыентуецца і якія вытрымлівае М.І. Мушынскі, ён перадае не толькі сваім чытачам, але і дактарантам, аспірантам, працай якіх кіраваў і даследаванні якіх характарызаваў як навуковы эксперт і апанент. Літаратуразнаўчая сістэма М. І. Мушынскага спрацоўвае ў розных аспектах: у гістарычных ацэнках, метадалогіі літаратуразнаўчых даследаванняў, падрыхтоўцы навуковых кадраў і інш. Гэтыя і адзначаныя вышэй факты яшчэ раз сведчаць пра тое, што навуковая школа М. І. Мушынскага не толькі сцвердзіла сябе, а знаходзіць свой працяг і развіццё ўжо на іншых узроўнях даследаванняў маладых вучоных нашай краіны. З поўным перакананнем можна сцвярджаць, што многія з тых маладых (ды і не толькі) даследчыкаў, якія асэнсоўвалі працы М. І. Мушынскага, мелі і маюць з ім разнастайныя навуковыя кантакты, адносяць сябе да яго вучняў. Такое адчасенне накладвае і адпаведныя абавязкі: быць годнымі свайго настаўніка. Тут можна правесці аналогію з вядомым сцверджаннем пра тое, што «*вучань не бывае вышэй за свайго настаўніка; але, удасканаліўшыся, будзе кожны, як настаўнік ягоны*» (Лука 6: 40). Як бы гэта ні банальна гучала, а праца, грамадзянская і навуковая пазіцыя М. І. Мушынскага даюць нагоду, падставы, інтэлектуальнае і духоўнае натхненне для такога ўзвышэння. Ён – Настаўнік для многіх навукоўцаў нашай краіны, памяркоўны, дасведчаны і шчыры дарадца па пытаннях гісторыі беларускай літаратуры і літаратурнай крытыкі, тэксталогіі, асоба, якая ў прафесійных і прыватных кансультацыях, парадах, гутарках душэўна і духоўна ўзвышае і натхняе калегу, суразмоўцу.

Асоба М. І. Мушынскага як вучонага, чалавека, калегі, сябра знакавая для многіх тых, хто мае з ім рознага кшталту кантакты. Гэтая знакавасць – у яго выключным грамадзянскім і навуковым сумленні, чалавечнасці, прафесійным і міжасабовым разуменні.

*А. М. Макарэвіч, прафесар кафедры літаратуры і міжкультурных камунікацый МДУ імя А. А. Куляшова, доктар філалагічных навук*

---

[3] Мушынскі, М. І. І нічога, апроч праўды: Якой быць "Гісторыі беларускай літаратуры". – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – С. 3.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова